мастакі, стварылі дэкарацыі для тэатра. Мы дапамаглі стварыць асноўныя штрыхі танца і ўсю пастаноўку балета цалкам. Менавіта гэта ... прынесла столькі выразнай своеасаблівасці нашым спектаклям”, – адзначаў А.Бенуа [цыт. па: 3, с. 104].

Канцэпцыя аб'яднання “Свет мастацтва” зыходзіць з уяўлення пра тэатр найперш як пра відовішча, “свята для вачэй”, паглыбляючы гэтым самым відовішчную аснову балетнага жанру. Таму задачай, якую ставілі стваральнікі “новага рускага балета”, было стварэнне відовішча, якое здзіўляе раскошай і пышнасцю і ўводзіць гледачоў у ірэальны, рамантычны, умоўнатэатральны свет.

Свае мастацкія і эстэтычныя ідэалы, свой погляд на мастацтва балета А.Бенуа ў поўнай меры выявіў пры стварэнні і пастаноўцы спектакляў “рускіх сезонаў” у Парыжы. Лепшыя яго працы – пастаноўкі балетаў “Павільён Арміды”, “Шапэніяна”, “Пятрушка” – прынеслі сусветную вядомасць рускаму балету.


1. *Абашев В.В.* Танец как универсалия культуры серебряного века // Время Дягилева. Универсалии серебряного века: Материалы Третьих Дягилевских чтений / Перм. ун-т; Сост. В.В.Абашев. – Пермь, 1993. –Вып. 1. – С. 12 –17.

2. *Бенуа А.Н.* Мои воспоминания: В 2 т. – М.: Наука, 1980. – Т. 1–2.

3. *Давыдова М.В.* Очерки истории русского театрально-декорационного искусства XVIII – начала XX века. – М.: Наука, 1974. – 188 с.

4. *Левая Т.И.* Русская музыка начала XX века в художественном контексте эпохи. – М.: Музыка, 1991. – 166 с.

5. *Сергей Дягилев* и русское искусство: В 2 т. / Авт.-сост. И.С.Зильберштейн, В.А.Самков. – М.: Изобразительное искусство, 1982. – Т. 1.



*К.У.Міхайлава*


## ДА ПЫТАННЯ АБ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку XXI ст. фарміруецца асоба новага тыпу, якую характарызуе высокі ўзровень інфармацыйнай культуры. Паняцце “інфармацыйная культура” цесна ўзаемадзейнічае з такімі паняццямі, як “бібліяграфічная культура”, “экранная культура”, “культура разумовай працы”.

Інфармацыйная культура сфарміравалася ў працэсе актывізацыі механізмаў інфармацыйнага абмену ў сувязі з узмацненнем ролі інфармацыі ў сацыякультурных працэсах. У публікацыях, у тым ліку і беларускіх вучоных, разглядаюцца гуманітарныя аспекты інфармацыйнай культуры, такія як:

– дзейнасць чалавека па атрыманні, апрацоўцы, захаванні і перадачы інфармацыі;

– праблемы павышэння інфармацыйнай культуры грамадства і яе прававое рэгуляванне;

– фарміраванне інфармацыйнай культуры ў розных плоскасцях – сацыяльнай, псіхалагічнай, маральна-этычнай.

Фарміраванне ў асобы сацыяльна неабходнага ўзроўню інфармаванасці, якая выступае абавязковай умовай сацыялізацыі, тлумачыцца ў сацыяльнай плоскасці.

У псіхалагічнай плоскасці звяртаецца ўвага на выпрацоўку навыкаў псіхагігіены ўспрымання інфармацыі, рэакцыі на інфармацыю і адэкватныя паводзіны асобы, уменне атрымліваць з масы даных неабходныя, суадносіць іх з папярэдняй інфармацыяй, крытычна пераасэнсоўваць.

Пытанні, звязаныя з выхаваннем адказнасці за распаўсюджванне інфармацыі, прынцыпаў, якія папярэджваюць дэзінфармацыю, маніпуліраванне свядомасцю людзей, разглядаюцца ў маральна-этычнай плоскасці.

Культура асобы, як адзначае прафесар А.С.Зубра, уключае візуальную, сацыяльную, духоўную, псіхалагічную культуру і культуру цела. На наш погляд, інфармацыйная культура асобы з’яўляецца квінтэсенцыяй усіх гэтых відаў культуры. Менавіта яна фарміруе статус асобы, каштоўнасныя арыентацыі, матывы, функцыянальныя ролі, гэта значыць сацыяльную культуру. Інфармацыйная культура дае магчымасць развіццю і ўдасканаленню інтэлектуальнай, эстэтыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най, маральнай, валявой культуры, культуры светапогляду і пачуццяў, наогул духоўнай культуры. Ад інфармацыйнай культуры у значнай ступені залежаць і псіхалагічныя працэсы, стан, якасці, сензітыўнасць, эмпатыя, рэфлексія. Інфармацыйная культура асобы садзейнічае набыццю высокай візуальнай культуры (культура знешняга выгляду, адзення, мовы, эмоцый, разумовай працы). Культура цела (чысціня, акуратнасць, здароўе) таксама фарміруецца пад уплывам інфармацыйнай культуры. Такім чынам, менавіта інфармацыйная культура аб'ядноўвае і забяспечвае працэс і культуры дзейнасці, і свядомасці.

Інфармацыйная культура цесна звязана з бібліяграфічнай культурай. Працэс бібліяграфавання ўяўляе такую аналітыка-сінтэтычную апрацоўку інфармацыі, якая дазваляе не толькі звяртацца да першакрыніц, але і атрымліваць на падставе адной лагічнай перапрацоўкі новую, выніковую (у адрозненне, напрыклад, ад атрыманай эксперыментальным або вопытным шляхам) інфармацыю. Такая здольнасць бібліяграфіі значна павышае магчымасць поўнага эфектыўнага выкарыстання змешчанай у тэксце інфармацыі, што і з'яўляецца канчатковым вынікам, на дасягненне якога накіраваны ўсе бібліяграфічныя працэсы.

Аднак бібліяграфічная культура – паняцце даволі шырокае, яно ўключае не толькі ўменні і навыкі бібліяграфавання, бібліяграфічнага (інфармацыйнага) пошуку, але і агульных ведаў, і методыкі рацыянальнай работы з кнігай. Па сутнасці розныя працэсы і асобныя методыкі работы з кнігай – гэта бібліяграфічная работа. На этапе папярэдняга знаёмства з кнігай адбываецца знаёмства з тыпалогіяй і сістэматызацыяй кнігі, з тэорыяй і методыкай інфармацыйнага пошуку. На этапе чытання і лагічнай перапрацоўкі зместу кнігі такія віды работы, як падкрэсліванне, састаўленне планаў прачытанага, канспектаў, запіс думак, напісанне рэцэнзій на прачытанае, па сутнасці з'яўляюцца элементамі бібліяграфічных працэсаў анатавання і рэферыравання. Акрамя таго, бібліяграфічны характар маюць і паказальнікі, і бібліяграфічныя спісы па тым ці іншым пытанні, складаемыя чытачом у працэсе чытання, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складанне чытачом іншых бібліяграфічных звестак (напрыклад, дамашніх рабочых картатэк, каталогаў і інш.) на этапе сістэматызацыі вынікаў самастойнай работы з кнігай.

Відавочна, што бібліяграфічная культура займае адно са значных месцаў у працэсе фарміравання інфармацыйнай культуры асобы. Разуменне бібліяграфічнай культуры і яе сувязі з інфармацыйнай культурай асобы зыходзіць з самой сутнасці бібліяграфічных працэсаў.

---


1. *Борисова С.В.* Библиотечно-библиографические знания студентов// НТБ СССР. – 1988. – № 4. – С. 23–24.

2. *Брежнева В.В.* Формирование информационной культуры личности: роль библиографа // Мир библиографии. – 1998.–№4.–С. 21–23.

3. *Зиновьева Н.Б.* Формирование личности нового типа // Библиография. – 2000. – № 1. – С. 33–39.

4. *Зубра А.С.* Среда, растящая личность// Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 8. – С. 30–35.

5. *Косарева О.А.* Библиографическая культура в общей культуре личности // Информационная культура личности: прошлое, настоящее, будущее: Сб. ст. – Краснодар, 1996. – С. 404–406.

6. *Коряковцева Н.А.* Библиотека в информационном обществе // Проблемы культуры и искусства: Тез. докл. Всерос. конф. аспирантов. Санкт-Петербург, 25 апр. 1996 г. – СПб., 1996. – С. 29–30.

7. *Леончиков В.Е.* Информационные потребности личности // Информационная культура личности: прошлое, настоящее, будущее: Сб. ст. –Краснодар, 1996. – С. 66–67.

8. *Минкина В.А.* Информационная культура и способность к рефлексии // Высшее образование в России. – 1995. – № 4. – С. 27–36.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ю.У.Міцкевіч*

## РОЛЯ АСОБАСНЫХ І ПРАФЕСІЙНЫХ ЯКАСЦЕЙ МЕНЕДЖЭРА Ў ПРАЦЭСЕ РЭКЛАМНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ